# Калейдаскоп

снежань 2023

**Школьная газета №4 (54)**

*“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная”*

*Ф. Багушэвіч*






# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**снежань 2023**

**Магутнае слова, ты, роднае слова! Са мной ты на яве і ў сне, душу мне затрэсла пагудкаю новай, ты песень наўчыла мяне. (Янка Купала)**

**З усяго таго, што лягло назаўсёды ў аснову святыні народа, бяссмерця яго, – ты выткана, дзіўная родная мова. (Максім Танк)**

**Мова не можа быць дрэннай, або добрай … Бо мова – гэта толькі люстэрка. Тое самае люстэрка, на якое нельга наракаць. (Сяргей Даўлатаў)**

**Усе найгалоўныя замежныя мовы можна вывучыць за шэсць гадоў, але для вывучэння сваёй недастаткова і цэлага жыцця. (Вальтэр)**

**Мова, якой мы карыстаемся, уплывае на наша мысленне … (Бернар Вебер)**

**Найвялікшая багацце народа – яго мова! Тысячагоддзямі назапашваюцца і вечна жывуць у слове незлічоныя скарбы чалавечай думкі і вопыту. (Міхаіл Шолахаў)**

**Неўміручасць народа – у яго мове. (Чынгіз Айтматаў)**

**…Нездарма шматпакутныя народы, пераносячы самыя страшныя ўдары лёсу, не могуць толькі перанесці пагібелі роднага слова… (Нестар Катлярэўскі)**

**Што ні кажы, а родная мова заўсёды застаецца роднай. Калі хочаш гаварыць па душы, ніводнага французскага слова ў галаву не ідзе, а калі хочаш бліснуць, тады іншая справа. (Леў Талстой)**

**Мова – вопратка думак. (Сэмюэл Джонсан)**



# Народныя традыцыі

Калейдаскоп
снежань 2023

## СНЕЖАНЬ



Першы месяц зімы і апошні каляндарнага года атрымаў назву снежань ад слова “снег”. **Старабеларускае найменне** яго — **прасінець** (у значэнні “прасвет у воблаках”), стараруское — студеный, французскае перыяду рэвалюцыі — фрымер (“намаразь”). Рускі декабрь, французскі décembre, англійскі december, нямецкі Dezember паходзяць ад лацінскага december (дзесяты — у старажытнарымскім календары).

**Снежань** — найбольш пахмурны месяц у годзе. У ім ёсць і самы кароткі дзень года — 21-га або 22-га (7—8 гадзін).

Сярэднемесячная тэмпература складае ад 5...6 градусаў марозу на паўночным усходзе рэспублікі да 2...3 градусаў на крайнім паўднёвым захадзе.

Фенолагі лічаць прадзім’ем час ад першага з’яўлення снегу да ўстанаўлення сталага зімовага пакрову.

# Народныя традыцыі



***Апошні месяц года, які «зямлю грудзіць, хаты студзіць, год канчае, зіму пачынае». Казалі: “Будзе снежань цёплы, дык і лета такое ж”, «У снежні адкрытае вуха — летам горача і суха». Правяралі і ўрадлівасць наступнага лета: «У снежні мароз і снег вышай хаты — год будзе багаты».***

**4 снежня.** Увядзенне. Назву свята праваслаўнай царквы народ тлумачыў так: «Бог прыводзіць зіму на зямлю». Прадугледжвалася магчымае пацяпленне: «Уведзенне разбіваець ледзенне».

**7 снежня**. Кацярына. Усё больш упэўнены наступ снежнай зімы адчуваўся з кожным днём: «Прыйшла Кацярына — прыйдзе і пярына».

**9 снежня**. Восеньскі (ці зімовы) Юр’я. Пра яго гаварылі, што ён «грудай гвоздзіць». У народнай прыкмеце гаворыцца: «Колькі на асенняга Юр’я снегу, столькі на вясенняга — травы».

**13 снежня.** Андросы (Андрос, Андрэй, Андрэйкі). Дзявочае свята. Народная традыцыя амаль нічым не звязана з хрысціянскім праслаўленнем апостала Андрэя Першазванага. Гэта адзін з 12 вучняў Хрыста, брат апостала Пятра. Пасля зыходжання Святога Духа апостал Андрэй з Віфсаіды прапаведаваў у I стагоддзі Евангелле ў розных краінах, у тым ліку і на славянскіх землях. Празваны Першазваным таму, што першы быў прызваны Хрыстом на апостальскае служэнне.

**14 снежня**. Прарок Навум, сваім імем выклікаў адзіную асацыяцыю: «ум». Пра яго гаварылі так: «Навум розуму навучыць» або «Навум наставіць на вум». Таму і імкнуліся з гэтага дня вучыць грамаце дзяцей, спадзеючыся, што яны, дзякуючы Навуму, хутчэй і лепш засвояць навуку.

**17 снежня**. Варвара. Яе імя таксама вельмі красамоўна абыгрывалася народам. Галоўнае, што адзначаў селянін, гэта як ад Варвары паступова пачынае прыбываць дзень («на казіны скок»), такім чынам, былі ўсе падставы «папракнуць» яе за тое, што яна, Варвара, «ночы ўваравала, а дня прытачыла». Другое сугучнае выкарыстанне імені Варвары ў прыкметах — што «Варвара варыць», г. зн. на яе дзень магчыма праўнальна цёплае надвор’е напярэдадні вялікіх маразоў. Цёплая пагода на Варвару прадказвала добры ўраджай ільну на лета. Гэты дзень быў «бабскім» святам, таму не пралі кудзелі, але талакно малоць і лён трапаць дазвалялася. Адзначалі яго і як свята надрэчных вёсак дзеля таго, каб дзеці і жывёла не тапіліся. Каб лепш пладзілася жывёла і вялася скаціна, у адных мясцінах пякліся пірагі з макам, якія называлі «варэнне» (зноў жа блізка да імені Варвары з яўным разлікам на яе спагаду), у другіх кутках ляпілі з пшанічнага цеста галовы, рогі, ногі, капыты, вушы і кармілі спечаным худобу. У абодвух выпадках праглядваецца культ Варвары як заступніцы хатняй жывёлы.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**снежань 2023**

**18 снежня**. Сава (Саўка), як і Варвара, быў «бабскім» святам з тымі ж правіламі. Паколькі ён ішоў непасрэдна перад Міколам, то зваўся «Міколіным бацькам». Пра гэту «тройцу» гаварылі: «Барбара мосціць, Саўка цвякі вострыць, а Мікола прыбівае», маючы на ўвазе паступовае нарастанне маразоў. Калі на Саву надта дзьмуў вецер, такога ж ветру трэба было чакаць усю квадру пасля Пятра.

**19 снежня**. Мікола Зімовы. Багата адлюстраваны ў прымаўках: “Без Міколы не бывае ні зімы, ні лета”, “Хвалі зіму на Міколе”, “Да Міколы няма зімы ніколі”.

**22 снежня.** Ганны (Ганкі, Ганна). Гэты прыкметны ў годзе дзень (з астранамічнага пункту погляду — 21-22 снежня зяўляецца днём зімовага сонцастаяння) прысвечаны шанаванню праведнай Анны — маці Багародзіцы. Каталікі прысвячаюць гэтай падзей 26 ліпеня, дзень блізкі да летняга раўнадзенства.

**24 снежня**. Посная куцця. Пачатак Каляд (да 6 студзеня). Дзяўчаты варажылі, ці хутка выйдуць замуж. Насілі з песнямі “звязду”. Бытавалі прыказкі і прымаўкі звычайна тыя ж, што і ў праваслаўных: “Прыйшлі Калядкі, гаспадарам парадкі”, “Калядкі — добрыя святкі: бліны ды аладкі”, “На Каляды ясна — ясна й на Пятры”.

**25 снежня.** Раство каталіцкае (Каляды)

**30 снежня**. Дзень Сцяпана знамянальны тым, што заканчваўся тэрмін службы парабкаў. Чалавек, які ад Каляд і да Каляд працаваў на свайго гаспадара, мог адчуць сябе, нарэшце, больш-менш вольным: «На святы Сцяпан кажан парабак сабе пан!» Парабак дарабляў абгавораны тэрмін і спадзяваўся ў наступным годзе на больш выгадную дамоўленасць: «На святога Сцяпана найду другога пана».



### Размаўляй па-беларуску

**7 снежня** з мэтай папулярызацыі роднай мовы ў **5 «Г»** класе прайшла **віктарына «Размаўляй па-беларуску»**, якая садзейнічала пашырэнню і ўзбагачэнню слоўнікавага запасу школьнікаў, развіццю кемлівасці, цікавасці да роднай мовы. Вучні дружна выконвалі заданні і адказвалі на пытанні.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Лістраценка Т.М.**



# Папулярызацыя беларускай мовы



### На пачатку дарог

11 снежня былі падведзены вынікі Адкрытага конкурсу дзіцячай і юнацкай творчасці «На пачатку дарог», прысвечанага 110-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. Ва ўстанове дадатковай адукацыі «Эверэст» прайшло ўзнагароджанне прызёраў і пераможцаў конкурсу. Дыпломам ІІІ ступені ў намінацыі «Буктрэйлер» узнагароджана вучаніца 10 «Б» класа ДУА «Сярэдняя школа №23 г.Магілёва» Сапранкова Святлана. Віншуем з перамогай і жадаем творчых поспехаў!!!

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**






# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**снежань 2023**

**Калядкі**

**20 снежня ў рамках папулярызацыі беларускай культуры і з мэтай выхавання патрыятызму школьнікаў было праведзена фальклорнае свята «Калядкі».** У актавай зале было весела: прыйшлі калядоўшчыкі, якія забаўлялі гледачоў. А потым да іх далучылася цыганка, якая наваражыла ўсім прысутным многа шчасця і здароўя ў 2024 годзе. Загадкі і жарты, народныя анекдоты і частушкі гучалі са сцэны. А потым вучні 5 класаў паказалі батлейку «Цар Ірад», у якой, як і заўсёды, перамагло дабро. У правядзенні свята бралі ўдзел вучні 5- 11 класаў, што спрыяе згуртаванню ўсіх вучняў у адзіную сям'ю. А падрыхтоўка да свята ажыццяўлялася пад кіраўніцтвам настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А. А., Лстраценка Т. М. і Юрчанка С. А. Шанаванне славянскіх традыцый выхоўвае павагу да нацыянальнай культуры, а таксама папулярызуе родную мову.

**Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**











## 11 кастрычніка 225 год з дня нараджэння Адама Міцкевіча



**Адам Міцкевіч нарадзіўся 24 снежня 1798 года на Навагрудчыне** ў сям'і збяднелага шляхціца. Міцкевічы былі паланізаванымі беларусамі. Пачатковую адукацыю атрымаў у Навагрудскай дамініканскай школе. У 1815 паступіў на фізічна-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Праз год перавёўся на гістарычна-філалагічны факультэт. Тут узнікла таемнае студэнцкае таварыства філаматаў (сяброў навукі), адным з кіраўнікоў якога стаў Міцкевіч. У 1821 годзе таварыства філаматаў ператварылася ў таварыства філарэтаў (сяброў дабрачыннасці). Па ініцыятыве Міцкевіча быў створаны шэраг масавых арганізацый моладзі, у якіх меркавалася рыхтаваць новыя кадры для філарэтаў. Найбольш бунтарскі твор Міцкевіча гэтага перыяду – "Ода да маладосці" (1820). Адначасова з вершамі-маніфестамі стварыў цыкл рамантычных балад, што ў 1822 годзе ўвайшлі ў І том яго твораў. Сярод іх сусветна вядомыя "Люблю я!", "Рамантычнасць", "Свіцязь", "Рыбка", сюжэты якіх падказаныя беларускімі народнымі паданнямі і песнямі, славутая паэма "Гражына" (1823). У Вільні Міцкевіч распачаў сваю шматгадовую працу над самым сваім філасофскім творам – паэмай "Дзяды". Калі ў кастрычніку 1823года Міцкевіч вярнуўся з падарожжа ў Вільню, яго арыштавала следчая камісія. Паэт быў высланы ў цэнтральныя раёны Расіі. Вырашэнне з прызначэннем месца высылкі зацягнулася. Міцкевіч паехаў у Крым, там напісаў паэтычны цыкл "Крымскія санэты" і шэраг вершаў. Вясной 1826 года рэдактар "Московского телеграфа" ўвёў Міцкевіча ў маскоўскае літаратурнае асяроддзе.У лютым 1829 года Міцкевіч атрымаў дазвол выехаць за мяжу. У гэты час ён распачаў працу над галоўным сваім творам – паэмай "Пан Тадэвуш". У 1834 годзе распачаў працу над "Гісторыяй Польшчы", фантастычным творам "Гісторыя будучага", драмамі "Барскія канфедэраты" і "Якуб Ясінскі". Каб палепшыць матэрыяльнае становішча сям'і, Міцкевіч чытаў лекцыі па лацінскай літаратуры ў Лазанскай акадэміі, потым у Парыжы, на кафедры Калеж дэ Франс па гісторыі літаратураў славянскіх народаў. У 1848 годзе адначасова пачаў выдаваць у Парыжы штодзённую палітычную газету "Трыбуна народаў". У 1854 г. Міцкевіча накіравалі ў Стамбул пасланцам ад французскага міністэрства асветы. Там Міцкевіч дапамагаў польскім патрыётам. 26 лістапада 1855 года Міцкевіч нечакана памёр у Канстанцінопалі. Міцкевіч быў пахаваны на парыжскіх могілках у Манмарансі. У 1890 годзе рэшткі Міцкевіча перавезеныя ў Польшчу і пахаваныя ў нішы каралеўскага палаца Вавель у Кракаве побач з Т. Касцюшкам.

## 27 снежня 100 год з дня нараджэння Анатоля Вялюгіна



**Вялюгін Анатоль Сцяпанавіч** нарадзіўся 27 снежня 1923 года ў в. Машканы Сенненскага раёна ў сям'і фельчара. Беларускі паэт, кінадраматург, перакладчык.

У 1934 годзе пачалі друкавацца яго нататкі і замалёўкі ў часопісе «Іскры Ільіча», газетах «Піянер Беларусі», «Віцебскі рабочы». У 1938 годзе ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» быў надрукаваны яго першы паэтычны твор – верш «Матчына песня». У 1939 годзе паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. Вучыўся і адначасова працаваў у рэдакцыях газет «Звязда», «Чырвоная змена», «Піянер Беларусі». Восенню 1940 года стаў вольным слухачом сцэнарнага факультэта Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі, дзе лекцыі чытаў А. Даўжэнка.

У гады Вялікай Айчыннай вайны малады паэт разам з роднымі эвакуіраваўся на Урал, дзе ён вучыўся ў Свярдлоўскім педагагічным інстытуце. У 1942 годзе Вялюгін стаў курсантам Лугінскай авіяцыйнай школы. Ён удзельнічаў у баях на Сталінградскім фронце, дзе атрымаў раненне. У 1945–1946 гг. працаваў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» ў Мінску. У 1946 годзе яго прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі, у 1947 годзе выйшла першая кніга паэта «Салют у Мінску». У 1948 годзе скончыў Мінскі педагагічны інстытут. У 1946–1984 гг. з невялікімі перапынкамі працаваў рэдактарам аддзела паэзіі часопіса «Полымя».

За зборнік вершаў «Голуб на вежы» паэт атрымаў званне лаўрэата 1-й ступені Усебеларускага фестывалю моладзі. У 1964 годзе за паэму «Вецер з Волгі» была прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы. Аўтар зборнікаў «Салют у Мінску» (1947), «Негарэльская арка» (1949), «На зоры займае» (1958), «Насцеж» (1960), «Песня зялёнага дуба» (1989), «З белага камення – сіняе пламенне» (1993) і іншых паэтычных зборнікаў для дзяцей. Паэт пераклаў на беларускую мову паэмы М. Лермантава, Л. Украінкі, вершы А. Міцкевіча, У. Маякоўскага, Ю. Тувіма і шмат іншых. Анатоль Сцяпанавіч – укладальнік і рэдактар выдання «Анталогія ўкраінскай савецкай паэзіі».

Па яго сцэнарыях на кінастудыі знята 45 дакументальных стужак, з іх 16 – поўнаметражныя. Пастаўлены мастацкія кінафільмы: двухсерыйны «Рэха ў пушчы» (1977), «Глядзіце на траву» (1983) паводле ваенных навел Янкі Брыля. У 1968 годзе за сцэнарый хранікальна-дакументальнага фільма «Генерал Пушча» быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1969). Апошняя кніга паэзіі «Заклён на скрутны вір» выйшла ў свет пасля смерці пісьменніка ў 1995 годзе. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й ступені, «Знак Пашаны», медалямі.

Памёр 24 кастрычніка 1994 года.

# Літаратурная старонка



**Навагодняе віншаванне**

Ад елак навагодніх пах смалы,
З гадзіннікаў хвіліны ўніз сцякаюць.
Чакаюць навагоднія сталы,
І келіхі крыштальныя чакаюць..
Ім засталося ўжо няшмат чакаць,
І хутка ў іх шампанскае пальецца,
Каб Новы год з сябрамі сустракаць...
Гадзіннік б’е...
Ну, вось і ўсё, здаецца!
І год стары, нібыта гаспадар,
Сваю сядзібу спешна вызваляе.
Апошні ліст губляе каляндар,
І коркамі шампанскае страляе!
Гадзіннік б’е...
Ён б’е за разам раз!
І ў гэта пераходнае імгненне
Жадаю, каб ўсё збылося ў вас:
Усе надзеі, мары і памкненні!
І каб здароўе вас не падвяло,
І каб у вас было ўсяго навалам!
(Вось толькі гора каб паменш было...)
І каб у кожнай справе шанцавала!

Генадзь Аўласенка



# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**снежань 2023**

## Калі настае Новы год

Новы год – гэта самае старажытнае свята з усіх, якія толькі існуюць на зямлі. Першымі зрабілі запіс пра святкаванне Новага года яшчэ ў Вавілоне, у другім тысячагоддзі да нашай эры. З таго часу Новы год святкуецца весела і шумна, а само свята стала прыгожай традыцыяй. Гэта цудоўнае, светлае свята ўсе народы адзначаюць па-свойму, паводле непаўторных звычаяў. Праўда, гэты дзень выклікае аднолькавыя пачуцці радасці і надзеі на лепшую будучыню. Танцы, песні, гульні, святочная варажба прыносяць задавальненне ўсім людзям.   Напрыклад, немцы ў навагоднюю ноч складаюць прагноз надвор'я на год. Яны робяць гэта так: дванаццаць цыбулін – па колькасці месяцаў – кладзецца на стол. Папярэдне ў кожнай адразаецца хвосцік і ў невялікае паглыбленне засыпаецца соль. З дванаццатым ударам гадзінніка прагноз гатовы: цыбуліны, у якіх соль засталася, азначаюць сухія месяцы, а якія «з'елі» ўсю соль – дажджлівы і снежны час. Да навагодняй ночы немцы загадзя рыхтуюць ракеты, феерверкі, бенгальскія агні і шмат іншага, што страляе і рассыпае іскры.  Здаўна існавала павер'е, што на парозе Новага года грукатам і мігценнем феерверкаў можна адагнаць ад дома нячыстую сілу, каб яна не прынесла няшчасця ў гэтым годзе. У Грэцыі, як толькі гадзіннік паказвае дванаццаць, кожны, хто сядзіць за навагоднім сталом, атрымлівае кавалак пірага з сюрпрызам. Есці яго трэба асцярожна. Каму трапіць горкі перац, таму не будзе шанцавання. Калі ў кавалачку пірага знойдзецца манета ці пярсцёнак, то гэта да шчасця, кахання і багацця. У Іране на навагодніх сталах абавязкова павінна быць сем страў, назвы якіх пачынаюцца з літары «с». Лічыцца, што іначай гаспадары не будуць шчаслівымі ў наступным годзе. У Італіі, каб назаўсёды развітацца з мінулагоднімі няўдачамі, у апошнія хвіліны старога года з вокнаў будынкаў, нават шматпавярховых, выкідваюць непатрэбныя рэчы. Цікава, што часам уніз ляціць і старая мэбля.   У Японіі на Новы год людзі ўпрыгожваюць дзверы галінкамі сасны, бамбука і слівы. Сасна азначае даўгалецце, бамбук – стойкасць, а сліва, што квітнее сярод зімы, абяцае жыццярадаснасць сярод нягодаў жыцця.  Яшчэ японцы лічаць, што чалавечае жыццё азмрочваюць сто восем нягодаў. Каб пазбавіцца ад іх, свята Новага года адзначаюць ста васьмю ўдарамі бронзавых званоў. Гукі ўдараў нават транслююцца па радыё і тэлебачанні.   Вось так шумна і весела сустракаюць у розных краінах светлае свята – Новы год.



# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**снежань 2023**







**9 снежня 1891года нарадзіўся Максім Багдановіч**



**Рэдкалегія: Кудраўцаў А.(9б),**
**Крупянкова А.(9б),**
**Фруцкая А.(9б),**
**Шаўцоў Д.(9б)**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**